# ЗБЫЛОСЯ! МАСТЫ СТАЛІ МАСТАМІ СУГУЧНАСЦІ!

Мне шанцуе на гарады. Куды б я ні прыехала, там спраўляюць ці Дажынкі, ці юбілей горада. Але найбольш пашанцавала ў Мастах! 17 мая тут адбыўся першы рэспубліканскі фестываль паэзіі «Масты сугучнасці»! Як нарадзілася такая ідэя? Усё вельмі проста. Аб'яднаўчая ідэя форуму знаходзіцца ўжо ў самой назве раённага цэнтра – Масты. Менавіта на гэтым утульным куточку Прынёмання вырашана было спыніць выбар у ходзе аднаго з пасяджэнняў Савета Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Прапанова старшыні абласной пісьменніцкай арганізацыі – адгукнуцца на ініцыятыву СПБ і прыдумаць мерапрыемства, якое б стала своеасаблівым мостам да сэрцаў чытачоў атрымала



ўвасабленне. Слова за словам, нарадзіліся «паэтычныя масты», якія злучаюць пакаленні і светапогляды. А дзе масты? Самы вялікі ў нашай краіне пешаходны падвясны мост – у горадзе Масты. Акрамя таго, там і самая сучасная раённая бібліятэка, і вялікі чыгуначны вузел, а ў Мастоўскім раёне (аграгарадок Гудзевічы) яшчэ і славуты літаратурна-краязнаўчы музей. Ідэю аб наданні Мастам статуса цэнтра, які аб'яднае паэтаў з усёй рэспублікі, падтрымаў Мастоўскі райвыканкам.

Шыкоўная візітоўка! Ці не так? Хто не змог прыехаць, далучыўся да круглага стала па тэме «Паэзія на ўсе часы: творы і творцы» ў фармаце «анлайн». На круглым стале было агучана шмат слушных прапаноў, ідэй, аналізаваныя лепшыя паэтычныя зборнікі, якія выйшлі нядаўна ў свет у выдавецтвах краіны. Дарэчы, тым часам кнігі выдавецкага дома «Звязда» мастаўчане з задавальненнем набывалі на арганізаванай перад уваходам у бібліятэку кніжнай выставе.

Вядома, шмат кніг удзельнікамі літаратурнага форуму было падорана чытачам. Іх з удзячнасцю прыняла дырэктар Мастоўскай раённай бібліятэкі Таццяна Стэльмах. Яна правяла экскурсію для гасцей па кніжным храме, якім немагчыма не захапляцца.

Затым паэты падзяліліся на тры групы. Перад дарослай чытацкай аўдыторыяй выступілі ў бібліятэцы, перад дзіцячай — у другой сярэдняй школе, перад падлеткамі – у Мастоўскім раённым цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. Гэта былі не проста выступленні з чытаннем вершаў, а жывы дыялог з чытачамі. Столькі пытанняў нам яшчэ не задавалі нідзе!

А юная мастоўская мастачка Алена Якушэвіч нават паспела намаляваць алоўкам партрэты любімых паэтаў. На адным з іх — я, аўтар гэтага рэпартажа.

Не саступілі ў сваёй цікаўнасці да беларускай паэзіі і чытачы ў аграгарадку Гудзевічы, дзе падмурак любові да роднага слова заклаў для многіх пакаленняў вучняў і іх нашчадкаў славуты заслужаны настаўнік Беларусі Алесь Мікалаевіч Белакоз.

Госці пабылі на экскурсіі ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчага музеі, дзе захоўваюцца беларускія арыгінальныя выданні пачатку мінулага стагоддзя і ўнікальная калекцыя дываноў, выкананых у тэхніцы падвойнага ткацтва.

Многія захацелі сфатаграфавацца каля старадаўняй аўтэнтычнай беларускай хаткі. А самае галоўнае, што беларускія паэты і чытачы на першым рэспубліканскім фестывалі паэзіі «Масты сугучнасці» знайшлі агульную мову, паразуменне і ўзаемна падзарадзіліся чыстай энергіяй шчырасці і дабрыні.

Наступныя фестывалі паэзіі ў Мастах плануецца праводзіць праз кожныя два гады.

**Тамара МАЗУР,**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі, удзельнік
Першага рэспубліканскага фестывалю паэзіі
«Масты сугучнасці»

*Выкарыстаны фота аўтара і Мастоўскай раённай бібліятэкі*



Цырымонія ўрачыстага адкрыцця






Мастоўская раённая бібліятэка – адна з самых сучасных у рэспубліцы



Дырэктар Мастоўскай раённай бібліятэкі Таццяна Іосіфаўна Стэльмах і ўдзельнік фестывалю, намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення СПБ, паэт Рагнед Малахоўскі



Круглы стол «Паэзія на ўсе часы: творы і творцы» адкрыла старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Л. А. Кебіч




Старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ
Т. А. Дземідовіч




Член СПБ, празаік, паэтэса Валянціна Драбышэўская (Мінск) прысвяціла свой даклад творчасці паэтэсы з Мастоўскага раёна Ірыны Данік



Адбылася акцыя «Кнігі – у падарунак Мастоўскаму краю»



Фонд Мастоўскай раённай бібліятэкі папоўніўся аўтарскімі выданнямі ўдзельнікаў фестывалю




Выступае самабытная беларуская паэтэса Таццяна Абухоўская (Масты)




Выступае член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур (Скідзель).




Тамара Мазур. Аўтар партрэта Алена Якушэвіч, аловак






На экскурсіі ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі (Мастоўскі раён)



Тамара Мазур у Гудзевічах. 17 мая 2024 года